Мы доўга размаўлялі з мілай Зояй Адамаўнай пра жыццё. Калі сталі пад`язджаць да Мінска, я дапамагла ёй вынесці ў тамбур цяжкі багаж.

—Вунь, вунь яны! — ледзь не закрычала мая спадарожніца, паказваючы на маладых людзей, што прабіраліся скрозь натоўп на пероне. — Прыйшлі сустракаць, мае саколікі. А вунь і сванечка з імі, —Зоя Адамаўна ажно зачырванелася ад радасці.

Я ўбачыла, як да яе падбегла высокая прыгожая маладзіца ў модным дэмісезонным паліто, як абняла, прытулілася да шчакі. Потым і зяць са сванькай падышлі. І падумалася, што, нягледзячы на гора, Бог падарыў Зоі Адамаўне і ладны кавалак шчасця...

Леанарда ЮРГІЛЕВІЧ
Email: 375299518893@yandex.by

НАВІНЫ

БРАВА, «ПРЫМАКІ»!

Гэты тэатр-студыя носіць званне народнага і апраўдвае яго. «Прымакоў» добра ведаюць не толькі ў нашым раёне, але і далёка за яго межамі.

Нядаўна «Прымакі» прынялі ўдзел у абласным фестывалі пад назвай «Карнавал весялосці» і заваявалі дыплом лаўрэата другой ступені.

СВЯТЛО НАД КАСЦЁЛАМ

На купалах дзятлаўскага касцёла ўсталявана падсветка.

Цяпер у цёмны час сутак людзі здалёк бачаць храм, і святлей становіцца ў іх на душы.

Леанарда ЮРГІЛЕВІЧ

ВЫБАРЫ Ў МАСТАХ БЫЛІ «ПРАЗРЫСТЫЯ»

З 213 празрыстых скрыняў для галасавання, устаноўленых на выбарчых участках Гарадзеншчыны, найбольшая колькасць прыпала на Мастоўскі раён — 28. Па 22 і 15 адпаведна ўстанавілі ў Дзятлаўскім і Зэльвенскім раёнах.

Аднак празрыстыя скрыні нічога не змянілі ў падліку галасоў. Як сведчаць незалежныя назіральнікі з кампаніі «Права выбару», што праводзілі назіранне на Цэткінскім выбарчым участку №5, пры падліку галасоў старшыня камісіі Таццяна Легеза не падпусціла іх бліжэй чым за 10 метраў да стала, на якім лічыліся галасы. Па словах абласнога каардынатара кампаніі Алега Рамашкевіча, назіральнікі засведчылі, што агулам выбарчыя камісіі давалі аднолькавыя лічбы, як бы спісаныя пад кальку.

Падчас выбараў старшыня камісіі не рэагавала на заўвагі назіральнікаў. Як прыклад на паўгадзіны часу выбарчы ўчастак стаў канцэртнай пляцоўкай. Сюды па разнарадцы быў накіраваны народны ансамбль Мастоўскага дома культуры «Ярыца». Сябры камісіі адначасова выдавалі бюлетэні і апладзіравалі артыстам. Гэта пры ўсім тым, што Выбарчы кодэкс забараняе прысутнасць на выбарчым участку іншых асобаў, акрамя тых, хто мае непасрэднае дачыненне да выбараў. На ўсё гэта Легеза адказала проста: «Мне падабаецца».

Язэп ПАЛУБЯТКА

НАВІНЫ

ДА МАСКВЫ НЕ ДАЕХАЎ

Мастаўлянін К. вырашыў з`ехаць на заробкі ў Расію. Як належыць, купіў білет на цягнік Гродна — Масква, але быў зняты з яго на бліжэйшым прыпынку ў Лідзе. Прычынай таго стала ўхіленне ад уплаты аліментаў.

Білеты, купленыя па прад`яўленні пашпарта, кантралююцца цяпер праваахоўнымі органамі.

Сёлетняй восенню мастаўляне сталі сведкамі яшчэ аднаго арыгінальнага спосабу ўтрымання адміністрацыйных штрафаў.

Падчас восеньскіх сельгасработ шматлікія брыгады ад цэнтра занятасці з горада выязджаюць у сельгаспрадпрыемствы на копку бульбы. Едуць пераважны тыя, хто не мае працы і хоча зарабіць грошы на жыццё. Сярод такіх сустракаюцца і тыя, хто мае адміністрацыйныя спагнанні. Калі яны атрымлівалі меншы заробак, чым іншыя, ім тлумачылі, што недаплачаныя грошы ўтрыманы на пагашэнне штрафу, бо папярэдне міліцыя разаслала ў сельгаспрадпрыемствы спісы сваіх даўжнікоў.

Язэп ПАЛУБЯТКА

ЦІ АДНОВЯЦЦА Ў МАСТАХ НАЧНЫЯ КРАМЫ?

Рашэнне беларускага ўраду аб аднаўленні гандлю алкаголем у начныя часы можа прывесці да аднаўлення працы начных крамаў у горадзе.

Ад сярэдзіны 90-х гадоў мінулага веку такія крамы існавалі. Напачатку гэта была «Галактыка», што месцілася ля кінатэатра «Сучаснік». Затым — «Ніва», што на Зялёнай вуліцы ля райаграпрамтэхнікі. Потым прыватная крама «Гурман» на вуліцы Будаўнікоў. Яшчэ была спроба наладзіць начны гандаль у краме райспажыўгандлю ў вёсцы Мікелеўшчына, якая знаходзіцца побач з аўтадарогаю Шчучын — Масты.

Гэтыя гандлёвыя аб`екты карысталіся попытам толькі ў адной катэгорыі пакупнікоў і прыносілі неблагі прыбытак.

Язэп ПАЛУБЯТКА

ТАК ЦІ ГЭТАК — УСЁ РОЎНА ПАТРЭБНА ЗАЯВА

Дырэкцыя СШ №5 азадачыла бацькоў вучняў.

На ўваходзе ў школу вывешана аб`ява наконт таго, што паступіла вакцына супраць грыпу. Усе вучні, якія жадаюць мець прышчэпкі, павінны прынесці ад бацькоў заявы і здаць у медпункт. Гэтак жа павінны прынесці заявы ад бацькоў і тыя дзеткі, хто не жадае рабіць прышчэпкі.

У школе амаль тысяча навучэнцаў.

Язэп ПАЛУБЯТКА

МАСТАЎЛЯНІН ПАЙШОЎ НА ПАВЫШЭННЕ

Загадам МУС РБ на пасаду начальніка Карэліцкага РАУС прызначаны падпалкоўнік міліцыі Валерый Салаўёў.



Начальнік Мастоўскага РАУС Валерый Салаўёў

Да гэтага часу ён працаваў намеснікам начальніка Мастоўскага РАУС, начальнікам міліцыі грамадскай бяспекі.


Валерый Салаўёў не карэнны мастаўлянін. Нарадзіўся ў Слуцку. Службу ў міліцыі пачаў у Гродне, у палку патрульнай службы. На пасаду намесніка начальніка Мастоўскага РАУС быў прызначаны два гады назад. Як адзначалі тады саслужыўцы, гэта яго чарговы крок па службовай лесвіцы. Так яно і адбылося.

Язэп ПАЛУБЯТКА

ВЫБАРЫ-2015

МАЕ НАЗІРАННІ

Яны датычаць назірання за людзьмі, з якімі мне давялося сустрэцца на апошніх выбарах.



Датэрміновае галасаванне

За тыдзень да пачатку галасавання патэлефанаваў знаёмы са сталіцы дый прасіць дзеля маніторынгу кампаніі паўдзельнічаць у назіранні. Ім не хапала прадстаўнікоў у правінцыі. Пагадзіўся.

Для гэтага неабходна было сабраць дзесяць подпісаў. Звяртаюся да сваіх знаёмых — адмовы няма. Паставіць подпіс у сваю падтрымку прашу знаёмага міліцыянера. Пагаджаецца, але перад тым доўга распавядае пра свае адносіны да гэтых выбараў «без выбару», ужываючы нелітаратурныя выказванні, і, нарэшце кажа: «Нам усім загадалі ісці галасаваць у першы дзень датэрміновага галасавання».

Праз паўгадзіны пасля пачатку галасавання на ўчастак заходзіць мой сябра. Праходзіць міма мяне, не заўважае, хоць на вуліцы заўжды вітаецца здалёк. Паспешна галасуе і гэтак жа моўчкі сыходзіць.

Сапраўды, у першы дзень папярэдняга галасавання на тым выбарчым участку галасавалі міліцыянеры, супрацоўнікі МНС ды настаўнікі школы, дзе знаходзіўся выбарчы ўчастак.

Як гэта было

Галасаваць прыходзіць пажылая кабета. Апратка паношаная. Проста з парога пачынаецца маналог: «Я галасую за нашага прэзідэнта. Дай бог яму здароўя і заўжды быць прэзідэнтам...»

У тым узнёслым выступе можна было пачуць радасць не толькі пра яе шчаслівую старасць і своечасовую пенсію. Кабета, не заходзячы ў кабіну, выказвала сваю падтрымку гэтаму кандыдату. «Дзякуй яму і за тое, што даў нашым жанчынам быць тры гады ў дэкрэтным адпачынку. Чаму ж не раджаць».

Пасля яе зыходу адна з сябраў камісіі прамовіла: «У яе ніколі не было дзяцей дый яна не ведае, як іх гадаваць».

Галасаванне адбываецца ў школе. Выбаршчыкаў няма. Выйшаў на ганак падыхаць свежым паветрам. У школу ідзе знаёмая кабета па ўнука. Як даведалася, што я назіральнік, кажа: «Усё зразумела без галасавання, каго выберуць. Я таксама буду галасаваць за яго. Набраў крэдытаў, няхай і расплачваецца».

Памаўчаўшы крыху, адказваю: «Унук твой дапаможа, як вырасце». Сышла, не сказаўшы ні слова.

Пад самае закрыццё ўчастка заходзіць мужчына гадоў 25 з дзяўчынкай дашкольнага ўзросту. Афармленне ідзе як належыць. Атрымлівае бюлетэнь ды кажа: «Жонка прасіла прагаласаваць за яе». Сябры камісіі касавурацца на мяне і тлумачаць, што тое нельга рабіць. Доўгае ўпрошванне камісіі канчаецца нічым. Тады, абураны, ён кажа: «З-за вас бацька недалічыцца аднаго голасу за сябе!»

У школе на 17 гадзін аб`яўлены бацькоўскі сход. Сабралася два дзясяткі бацькоў. Сход класная кіраўнічка правялі хутка. Не болей як за паўгадзіны. Міма пакоя для галасавання праходзяць бацькі вучняў. Адзін мужчына пытае кабету: «Настаўніца толкам так і нічога не сказала. Ніяк не магу ўцяміць: навошта нас збіралі?» Тая яму адказвае: «Каб мы змаглі датэрмінова прагаласаваць. Я ўзяла пашпарт і пайду прагаласую». Надалей мужчына сказаў такое, што мяне ўразіла і пацешыла: «А я яшчэ з работы адпрошваўся... Каб яны галасавалі бакамі».

З дваццаці чалавек, што прысутнічалі на сходзе, грамадзянскі доўг выканалі толькі трое.

Язэп ПАЛУБЯТКА

НАВІНЫ

ПАЖАРЫ І РАЗБОРКІ

На мінулым тыдні адбылася абласная відэаканферэнцыя па пытаннях абстаноўкі з пажарамі і гібеллю людзей. На канферэнцыі адзначалася, што колькасць пажараў на Гарадзеншчыне ў параўнанні з мінулым годам значна павялічылася. Прычынай тае нарады сталі трагічныя пажары на Мастоўшчыне.

Першая жудасная трагедыя адбылася 8 сакавіка ў вёсцы Нацкава. Там у агні загінулі трое малых дзетак. Самаму старэйшаму не было дзесяці гадоў. Па версіі супрацоўнікаў МНС, прычынай трагедыі стала гульня дзяцей з запалкамі. Бацькі на непрацяглы час дзетак пакінулі сам-насам. Яны пайшлі праводзіць гасцей у суседнюю вёску і замкнулі іх на ключ. Суседзі, заўважыўшы дым, выклікалі пажарных, але было позна.

Пасля гэтай трагедыі супрацоўнікі сельвыканкамаў, міліцыі і МНС правялі ў раёне буйнамаштабную праверку па пытаннях пажарнай бяспекі. Прайшла таксама і абласная канферэнцыя, на якой было вырашана ўсталяваць у шматдзетных сем`ях пажарную сігналізацыю, якая ў выпадку падобнага здарэння апавяшчала б сігналам на сотавы тэлефон бацькоў і мясцовае аддзяленне МНС. Але такое вырашэнне праблемы мае тэхнічныя складанасці і пакуль не вырашаецца.

Прычынай апошняй абласной нарады стаў таксама пажар у Мастоўскім раёне, які адбыўся ў вёсцы Руда Ліпічанская 22 верасня. У 11 гадзін вечара ў раённы аддзел выратавальнікаў сталі паступаць сігналы аб пажары і магчымым знаходжанні ў доме людзей. Дом быў ахоплены полымем, страляў шыфер, і людзі падысці да дома не маглі. Тут жыла 80-гадовая пенсіянерка. У той вечар у яе быў 54-гадовы сын, жыхар гэтай вёскі. Ён пасварыўся з жонкаю і прыйшоў да маці. У калідоры быў знойдзены труп мужчыны, а ў адным з пакояў — кабеты. Рабочая версія прычыны пажару — неасцярожнае абыходжанне з агнём (паленне ў ложку).

На Мастоўшчыне месяц таму адбыўся яшчэ адзін значны пажар — гарэў тарфянік ля вёскі Малыя Сцяпанішкі. Гэта самы буйны пажар у вобласці за апошнія гады. Яго тушылі на працягу двух дзён. На барацьбу з ім было задзейнічана 300 чалавек і некалькі дзясяткаў адзінак тэхнікі. Ачаг пажару знаходзіўся за 10 км ад Мастоў, але на другі дзень горад завалок смог.

Язэп ПАЛУБЯТКА

ВАЧЫМА ВІДАВОЧЦАЎ

МАЯ ВЁСКА

ПРА МЯСТЭЧКА ЛУННА І ЖЫЦЦЁ Ў ІМ РАСПАВЯДАЕ ВАЛЯНЦІНА КАРПОВІЧ, СТАРШЫНЯ СЕЛЬСАВЕТА З 1974 ПА 2004 ГОД


Валянціна Карповіч

1 верасня 1974 года адбыліся вялікія змены ў жыцці нашай сям`і. У сувязі з абраннем мяне старшынёй Лунненскага сельсавета мы пераехалі жыць у вёску Лунна.

Калгас купіў нам драўляную хату, якая нам спадабалася, бо тут мы былі самі па сабе: свой агарод, сад. Такога ў нас яшчэ не было. Мястэчка Лунна і вёска Сарочыцы, у якой мы жылі раней, былі непараўнальныя. Тут размяшчаўся калгас «Расія», сельгастэхніка, лясніцтва, прарабскі ўчастак ДРБУ, цагельны завод, сепаратарны пункт, пякарня, сяльпо, працавала каля дзесяці крамаў і сталовая, кірмаш, сярэдняя школа, дзе навучалася больш за 500 вучняў, дзіцячы садок на 25 месцаў, музычная і спартыўная школа па веславанні, пошта, ашчадная каса, тэлефонная станцыя з прарабскім участкам сувязі, клуб, бібліятэка, дом быту, аўтобусная каса, участковая бальніца з амбулаторыяй, аптэка. Больш за палову да таго сёння няма. Працавалі царква і касцёл. За Нёманам, недалёка ад палявога аэрадрома, размяшчаўся прафілакторый для лётчыкаў, дзе яны адпачывалі пасля палётаў.

Усё трэба было «знайсці»

На нас мястэчка рабіла ўражанне горада. Людзі тут жылі розныя. Былі такія, што цанілі багацце і ўмелі яго набыць, не надта ўлягаючы ў працу. Да настаўнікаў ставіліся паблажліва, але без пэўнай павагі.

Напаткала нас другая, не настаўніцкая, праца, жыццё ў новых абставінах, навідавоку ў мноства людзей. Паўстала мноства пытанняў, якія трэба было вырашаць, не ведаючы, як і з якога боку да іх падыходзіць.

Што першапачаткова паказалася прывабным, на практыцы стала галаўным болем. На той час за сельсаветам лічылася 128 камунальных кватэр, большасць з якіх былі старымі дамамі, якія засталіся пасля габрэяў, спаленых у Асвенціме. Тыя дамы прыстасавалі пад жыллё, зрабіўшы ў адным доме 2-3 кватэры з маленькімі пакоямі. Двары пры дамах цесныя, няма месца для невялікага агароду і «зручнасці» пад акном.

Цэнтр вёскі (каля 30 дамоў) карыстаўся адной калонкай для набыцця вады. Пытанні наконт рамонту пакояў, печаў, перакрыцця дахаў, ачысткі прыбіральняў, вывазу смецця былі бясконцымі. Вырашэнне іх абцяжарвалася адсутнасцю нармальнага забеспячэння сродкамі, матэрыяламі, рабочымі. Гэта ўсё трэба было «знайсці».

Знешні выгляд вуліц і стан дарог дрэнны. Агароджы каля хат — дзе ёсць, дзе няма. Засталіся хаты, напаўразбураныя з часоў вайны. Клуб знаходзіўся на Волі, у крыле занядбанага палаца Тарасовічаў, на самым ускрайку вялікай вёскі.

Што не падлягала рэвізіі, дык гэта гандаль. Працавалі крамы «Адзенне», «Гаспадарчыя тавары», «Галантарэя», «Мяса-малако», «Гародніна», «Прамысловыя тавары», дзве крамы з харчовымі таварамі, хлебная крама, кнігарня, крама па прыёме шклотары, нарыхтоўчы ларок і сталовая. У цёплую пару года адчыняў свае дзверы «Вецярок» для аматараў піва і безалкагольных напояў. Па нядзелях працаваў кірмаш, дзе прадавалася разнастайная свойская жывёла ды вырабы мясцовых майстроў. Можна было купіць яйкі, сыры, масла, смятану, насенне.

Найлепшы час

Найбольш заможнымі і ўдалымі ў развіцці вёскі былі 1980-1995 гады. Пабудавана новая школа і васьмікватэрны дом для настаўнікаў, дзіцячы садок на 90 месцаў, кінатэатр, куды перанеслі клуб, да будынка бальніцы дабудавалі з двух бакоў памяшканні для сталовай і дадатковых лячэбных кабінетаў і лабаранцкай. Бальніца магла прыняць 25 хворых на стацыянарнае лячэнне. Стары будынак амбулаторыі, напаўразвалены, быў куплены Аграпрамбанкам, які зрабіў з гэтага старога будынка мураванае двухпавярховае сваё аддзяленне. На прыгожым ускрайку вёскі выбудавалі двухпавярховы будынак лясніцтва з канторай і кватэрай для сям`і ляснічага.

Ад школьнай воданапорнай вежы пракладзі водаправод у бальніцу, банк, на пошту, у касцёл і аптэку. Ад свідравіны «Сельгасхіміі» вада была праведзена на хлебапякарню і жыхарам вуліцы Перамогі.

Узніклі новыя вуліцы — Сонечная і Маладзёжная — з двухпавярховымі катэджамі. Для забеспячэння вадой жыхароў новых вуліц пабудавана воданапорная вежа.

Палепшылася лазневае абслугоўванне. Дарожнікі пабудавалі сваю лазню з фінскай і рускай парылкамі, басейнам і більярдам. «Сельгасхімія» наладжвае сваю лазню на беразе рэчкі Лунянкі. Старая сельская лазня капітальна рамантуецца. У вёсцы ўзнікаюць прыватныя лазні. Вядзецца перапланіроўка і капітальна рамантуецца стары яўрэйскі двухпавярховы будынак, дзе размяшчаўся школьны інтэрнат, пад кантору ўтворанага замест калгаса саўгаса «Чарлёна» і пакоі сельсавета.

Былыя школьныя будынкі вытворчага корпусу і сталовай бясплатна перадалі людзям пад кватэры. Актыўна праводзіцца добраўпарадкаванне: вуліцы пашыраюцца, асфальтуюцца, некаторым вяртаюць іх гістарычныя назвы; праводзіцца нумарацыя дамоў, ставяцца новыя і папраўляюцца існуючыя платы. Прыводзяцца ў парадак каталіцкія і праваслаўныя могілкі. Дзякуючы фінансавай дапамозе з боку саўгаса, былі абгароджаны металічнай сеткай могілкі ў Навасёлках і Лунне. Каталіцкія могілкі пры вялікай актыўнасці ксяндза Люцыяна Радомскага і прыхаджан значна пашыраюцца і абносяцца капітальнай каменнай агароджай.


Былы габрэйскі дом


Рэшткі панскай сядзібы

Калі параўноўваць...

Нельга сказаць, што ўсё адбывалася гладка. Негатыў быў. Будаўніцтва вялося як бы не для сябе. Праз вельмі кароткі час у новых будынках школы, дзіцячага садка, прыбудовы да адміністрацыйнага будынка сельсавета дах стаў працякаць і яго неабходна было рамантаваць. Кінатэатр (ён жа клуб) спачатку зрабілі без ацяплення, і хоць падлогу калгасныя рабочыя зрабілі якасна, з-за адсутнасці вентыляцыі і наяўнасці сырасці яна вельмі хутка згніла. Школу адчынілі, а каналізацыйную помпавую станцыю не зрабілі. Як вынік — у новай школе туалеты не працавалі.

Большасць аб`ектаў будавалася так званым гаспадарчым спосабам, без належнай праектнай і тэхнічнай дакументацыі. Адпаведнай была і якасць. Ужо пасля мне будавалі «аграгарадок» і водаправод па вуліцы Гродзенскай. Як і раней, зрабілі без дакументацыі, на вока. Цяпер штогод зімой вады няма, замярзае.

Калі параўнаць цяперашні «аграгарадок» з вёскай канца 80-х, то гэта поўная дэградацыя. Чаму ж вёска прыйшла ў такі заняпад?

Лічу, што галоўная прычына ў поўнай ліквідацыі нават зародкаў самакіравання і грамадскай супольнасці, удзелу грамадзян у планаванні жыцця сваёй вёскі, вызначэнні прыярытэтаў.

Ліквідацыя гэта вялася паслядоўна і мэтанакіравана. Так, быў фактычна ліквідаваны бюджэт сельсавета, калі ўсе бюджэтныя арганізацыі — школа, бібліятэка, клуб, бальніца — былі пераведзены на цэнтралізаванае фінансаванне з раёна. Разам з ліквідацыяй бюджэту фактычна была ліквідавана магчымасць уплыву на гэтыя арганізацыі з боку дэпутатаў сельскага Савета. Дэпутаты ды і сельсавет сталі амаль непатрэбнымі, бо былі пазбаўлены фінансавага ўплыву. Тлумачылася гэтая цэнтралізацыя эканоміяй. Але выходзіла ўсё якраз наадварот: у сельсавеце як быў бухгалтар, так і застаўся, а ў раёне стварылі новыя пасады. Далей, пазбаўленыя ўлады сельсаветы не маглі перашкодзіць павальнаму закрыццю мясцовых прадпрыемстваў. У выніку за кароткі перыяд былі зачынены «Сельгастэхніка» з запраўчнай станцыяй, «Сельгасхімія», хлебапякарня, а затым і кандытарскі цэх, сепаратарны пункт, спартыўная школа, дарожна-рамонтны ўчастак. Адпаведна, зачыніліся і лазні гэтых прадпрыемстваў, цэх сувязістаў, прафілакторый, спартыўная школа, сяльпо, каля дзесятка крамаў, сталоўка і, нарэшце, кірмаш.

Катастрафічна знізілася колькасць працоўных месцаў. У выніку моладзь уся стала пакідаць вёску ў пошуках працы. Насельніцтва пастарэла настолькі, што многія не ў стане весці прысядзібную гаспадарку. У 2013 годзе грамадскі статак складаўся з чатырох кароў. Усё больш з`яўляецца пакінутых сядзіб.

І хоць на сённяшні дзень у вёсцы ёсць прыродны газ, многія дамы газіфікаваныя, ёсць вада, шэраг сацыяльных паслуг, моладзь тут жыць не хоча, бо працоўныя месцы ёсць толькі ў калгасе (як бы яго цяпер ні называлі) з нізкай, у 200-300 даляраў у эквіваленце, аплатай працы. І адсутнічае хоць якая перспектыва. Многія лунненцы аселі ў Расеі, Польшчы, Італіі.

Баліць мне душа за гэтую вёску, бо яна мая.

Запісаў
Язэп ПАЛУБЯТКА
Фота аўтара

ПЕДСОВЕТ

ПРОРОК И РЭПЕР МОХАММЕД АЛИ...

«Его имя останется в веках! Люди будут помнить о нем вечно!» — говорили древние о человеке, деятельность которого потрясала и меняла мир.



Но древние, кажется, погорячились. Где-то в глубинах современного общественного сознания зреет уверенность в том, что последним из «веков» может оказаться двадцать первый. Мол, наши дети... они уже не помнят великих имен. Им неведомы герои прошлого. И даже настоящего.

Так ли это на самом деле?

Чтобы ответить на этот вопрос, мы провели маленький эксперимент: составили список самых (казалось бы!) известных событий и выдающихся личностей со всего света и во всех сферах деятельности, а затем отправились с этим списком в самую обычную сельскую среднюю школу. Дабы определить широту и глубину исторических познаний поколения next...

И вот что из этого вышло...

Блицопросу подверглись только старшеклассники (с 8-го по 11-й класс), то есть народ почтенный, уже де-юре обремененный мешком элементарных знаний.

Школьники восприняли акцию с энтузиазмом. Самое живое участие в опросе принял даже преподаватель истории.

Наш список знаменитостей возглавлял **Юрий Гагарин**. Неудивительно! Этот человек и в космосе был первым. К счастью, выяснилось, что космонавта знают все без исключения ученики сельской школы. Правда, одному из восьмиклашек он был известен как Алексей, а другому девятикласснику как «космонафт Александр».

За Гагариным следовал маршал Советского Союза **Георгий Жуков**.

Тут многие призадумались... На вопрос: «Кто такой Жуков?» — подавляющее большинство учеников уверенно заявило, что сей человек обессмертил свое имя в... поэзии. Остальные видели в нем юмориста, актера, спортсмена, а кое-кто даже биолога! Лишь 6 из 35 опрошенных школьников назвали его военачальником, который утопил в крови самую мощную армию мира.

Майя Плисецкая как балерина знакома лишь пятерым школярам. Остальные считают ее «в принципе неплохой актрисой» и «талантливой циркачкой». А юное дарование из 8-го класса даже присвоило приме звание «народной певицы БССР»...

В беседе с детьми всплыли и новые сенсационные факты из жизни **Василия Ивановича Чапаева**. Оказывается, на самом деле он был героем не гражданской, а Великой Отечественной войны 1941-1945 годов! В этом абсолютно уверены почти все школьники. А вот мнения по поводу фронта, на котором сражался герой, разделились. Одни упирали: на белорусском! Другие спорили: на украинском! Кто-то из 9-го класса разжаловал командира дивизии Красной Армии до «председателя партизанского отряда».

Имя советского шахтера **Алексея Стаханова**, установившего в 1935 году рекорд по добыче угля, школьникам ни о чем не говорит. Знают его только двое учеников из 11-го класса. Зато всем отлично известен «качок», «терминатор», а по совместительству и губернатор штата Калифорния **Арнольд Шварценеггер**.

В тяжелую задумчивость впадали ученики, когда мы спрашивали их, в каком году произошла Великая Октябрьская революция. Диапазон дат был весьма широк: от 1811 до 1993 года. Один из восьмиклашек точно знал, что именно после октябрьского переворота произошел «распад СССР». И только 9-й класс был единодушен: 1917-й.

Нетленки **Владимира Высоцкого** детям хорошо знакомы. На слуху и фамилия школдливого поэта **Сергея Есенина**. А вот **Жюль Верн** прославился у нас как кулинар, а не писатель-фантаст. Другой же именитый француз, океанограф и создатель акваланга **Жак Ив Кусто** в действительности был архитектором. Эти имена школьникам мало знакомы.

Зато при упоминании **Дарьи Домрачевой** классы оживлялись. Все знают и любят Героя Беларуси, непревзойденную биатлонистку, ставшую легендой уже при жизни. Лишь одна ученица 8-го класса пропела строчкой Валерия Меладзе: «Она была актрисою...».

Вячеслава Фетисова обзывали кем угодно, но только не живой легендой советского хоккея.

Немного об Александре **Сергеевиче Пушкине**. Тут богатая фантазия учеников дала себе волю и подчас рисовала нам самые причудливые картинки. Некоторые считали, что великий поэт выяснял отношения на дуэли с другим не менее великим поэтом — Михаилом Лермонтовым. Кто-то уверял, что Пушкина застрелил из мушкета «какой-то Онегин». До слез умиляло: «Александр Сергеевич Пушкин подрался с Чеховым и Големом, и те закололи его своими шпагами». Только 4 из 35 школьников были точны: «Дантес», и трое точны отчасти: «Доктес», «Дзантес» и «Дутес»...

Иосиф Виссарионович Сталин у школяров почему-то совмещал должности «Директора СССР» и «Главного президента России», а иногда занимал вакансию «военного человека». Более или менее сносное определение ему дали в 11-м классе.

Никто ничего не слышал о выдающемся белорусском авиаконструкторе **Павле Сухом**. Лишь после «ориентировки» на мемориальный комплекс в Зельве Сухой был тут же зачислен в летчики и танкисты. И лишь двое заподозрили его в создании «Су»...

Еще забавнее обстояло дело с другим нашим соотечественником, писателем **Алесем Адамовичем**, по мотивам повести которого был снят фильм «Иди и смотри», до сих пор признанный самой проникновенной картиной о войне за всю историю мирового кинематографа. Школяры умудрились записать Алеся в композиторы. Обескуражила ученица 8-го класса: по ее мнению, Адамович в свое время был ведущим телепрограммы «Что? Где? Когда?»

А вот настоящий композитор **Пётр Чайковский** прославился среди наших детей не столько «Щелкунчиком», сколько «Мойдодыром» и «Мухой-цокотухой».

Больше всего досталось звезде мирового бокса **Мохаммеду Али** (Кассиус Марселлус Клей). Как его только не обзывал маленький ученый народец. Тяж совместил в себе не сочетаемое: он был и «пророк», и «террористом №1» одновременно. А в паузах между молитвами и терактами читал превосходный рэп!

Нашего земляка художника-авангардиста **Марка Шагала** юные гении помнят и любят. Но и этюды «знаменитого живописца» **Чарльза Дарвина** их восхищают не меньше. Кстати, мало кто из нас, пожилых, знает, но в последние годы своей жизни «...этот уважаемый англичанин переехал в Беларусь, где начал заниматься наукой и выступать на протестах».

Парочка школьников отлично знает рецепт успеха **Гая Юлия Цезаря**. По их мнению, консул Великой Римской империи вовсе никакой не консул, а всего лишь... салат. Да и величайшего французского полководца **Наполеона Бонапарта** некоторые дети представляют только в виде «вкусного торта»...

Украинский писатель **Николай Васильевич Гоголь** был иногда геолог. А актриса молодости нашей **Любовь Орлова** вместе с **Карлом Марксом** — крутые танцоры. Наслышаны дети об **Адольфе Гитлере** — «плохой человек и великий поработитель всех людей». Популярен **Владислав Ягайло** — «сначала король Беларуси, а потом — царь поляков». Чуть хуже с родственными отношениями знаменитостей. **Надежда Крупская** — «подруга Ильича», а по совместительству сестра и «мама большой шишки в СССР». Академик **Сергей Павлович Королев** — отец поп-дивы Наташи Королевой, а руководитель Крестьянской войны 1773-1775 годов в России **Емельян Пугачев**, здравствующий, кстати, и поныне, не кто иной, как «сын Аллы»...

Эпилог в цифрах и слезах

Всего было опрошено 36 человек. Из них: 35 школьников и 1 преподаватель истории. Из общего количества опрошенных на все вопросы правильно ответил только один человек — учитель.

Из 10 учеников 8-го класса треть списка освоили лишь 2 ученика.

Из 12 учеников 9-го класса отличились 3 ученика, ответив правильно на половину вопросов.

Из 6 учеников 10-го класса до половины списка едва дотянул 1 ученик.

Из 7 учеников 11-го класса только 3 ученикам известна половина героев.

4 из 35 школьников не ответили ни на один вопрос.

Наиболее сильные позиции в памяти детей у Дарьи Домрачевой и Юрия Гагарина (с чем их и поздравляем!). Самое слабое звено — Мартин Лютер Кинг.

Роман КАРПЕНКО

P.S. По этическим соображениям название школы и имя учителя не называются.



ПОДРОСТОК ЗАКЛЮЧЁН В ТЕЛО ПЕНСИОНЕРА

Как большинство 14-летних, Нил Битл обожает играть в компьютерные игры — знающие его люди, говорят, что у него очень умные глаза, добрая душа и детская непосредственность. Тем не менее этот мальчик выглядит как мужчина преклонных лет с морщинами на коже, лысой головой и покрученными конечностями.



Он весит всего 12,5 кг, а его рост достигает всего 120 см.

Нил, проживающий на окраине Мумбаи (Индия), болен редким генетическим расстройством под названием прогерия, или синдром Хатчинсона-Гилфорда, из-за которого организм человека стареет в 8 раз быстрее нормы.

Сейчас мальчику нравится рисовать и играть со своими игрушками, однако уже через несколько лет все это ему будет не по силам.

Его разум останется молодым, однако тело состарится, а здоровье сильно ухудшится.

Нила уже перестал посещать школу после того, как одноклассники начали подшучивать над ним. Они называли его Ауро — человек, больной прогерией, которого сыграл актер Амитабх Баччан в болливудском фильме «Паа». Когда один из парней сказал, что у Нила также случится сердечный приступ, как у героя фильма, он отказался ходить в школу.

У больных прогерией имеется генетическая предрасположенность к заболеваниям сердца, зачастую они не проживают больше 14 лет. Всего несколько больных прожили более 20 лет, согласно данным медицинской литературы.

Тем не менее в декабре прошлого года Нила отправили в фонд исследования прогерии в Бостоне, где он стал участником клинических испытаний нового препарата для лечения рака, который, по мнению врачей, должен замедлить процесс старения.

Неизвестно, поможет ли это продлить жизнь парня, поэтому уже в ближайшее время он надеется воплотить свои заветные мечты в реальность — например, встретиться с роботом ASIMO от компании Honda и посетить Диснейленд в Калифорнии.

Прогерия — очень редкое заболевание. Согласно данным Фонда исследований прогерии, в мире проживает не более 200-250 пациентов.

С греческого языка слово «proeros» означает преждевременно состарившийся. Заболевание вызывает генетическая мутация гена LMNA, ответственного за выработку протеина, поддерживающего структурную целостность клеточных ядер.

Когда ядро теряет силу, структура клетки ослабевает, что ведет к быстрому старению.

Годами семья не знала, что происходит с Нилом. До 18 месяцев он выглядел здоровым, затем родители заметили на коже мальчика несколько темных и светлых пятен. С годами стало ясно, что-то пошло не так: он перестал расти и развиваться, как нормальный ребенок. Его суставы ослабели, волосы выпали, вены стали очень заметными, а кожа резко состарилась.

Нил посетил нескольких врачей, которые сказали, что у него генетическое заболевание, но не сказали, какое именно. Только пять лет назад доктор Параг Тамханкар, педиатр и генетик из Мумбаи, поставил Нила диагноз прогерия.

eurolab.ua

КАК АВТОМОБИЛЬНЫЕ ШИНЫ НАНОСЯТ ВРЕД ЛЁГКИМ

Невидимый загрязнитель, продуцируемый автомобильными шинами, является более опасным для легких, нежели считалось ранее.



Ученые, изучавшие воздействие газовой сажи на организм, выяснили, что вещество, вызываемое эмфизему и повреждения ДНК у курильщиков, образуется во время тления сигареты.

Однако, поскольку невидимые для человеческого глаза частицы также образуются в процессе изнашивания автомобильных шин, опасность газовой сажи, по мнению ученых, была ранее недооцененной.

Авторы исследования выделяют, почему повреждение легких, связанное с курением, является неизлечимым — поскольку наночастицы невозможно устранить из легких после того, как они впитались.

Ученые изучали, почему легкие мертвых курильщиков являются черными внутри, а также воздействие газовой сажи на мышей. Исследователи выяснили, что причина заключается в скоплении крошечных наночастиц сажи — ранее считалось, что это связано со смолой, алюминием или каким-то другим темным пигментом.

Открытие тем более удивительно, поскольку наночастицы являются невидимыми для человеческого глаза и достигают в размере всего 30-40 нанометров — диаметр человеческого волоса составляет 100000 нанометров.

Помимо повреждения легких, они выяснили, этот черный материал также накапливается в части иммунной системы под названием дендритные клетки, вызывая повреждения на генетическом уровне.

Также оказалось, что частицы вызывают двойные разрывы в нити ДНК человека — нарушение, при котором клетки имеют проблемы с восстановлением — и приводят к хроническому воспалению в легких.

Сажа также вызывает эмфизему — повреждение легких, вызывающее хроническую одышку. Чем меньше размер частиц сажи, тем выше их токсичность, считают ученые.

eurolab.ua

ВМЕСТО ОПУХОЛИ ВНУТРИ МАЛЬЧИКА С СИЛЬНЫМИ БОЛЯМИ В ЖИВОТЕ ОБНАРУЖИЛИ МЁРТВЫЙ ПЛОД

Четырехлетний мальчик в Индии родился «как бы беременным» из-за крайне редкой аномалии.

Мальчик из деревни Карикабандх в районе Миднапор Западной Бенгалии родился с плодом внутри живота.

У мальчика редкая аномалия под названием «плод внутри плода» — крайне редкий порок, встречающийся 1 раз на 500000 новорожденных, а в медицинской литературе описано всего 200 подобных случаев.

На прошлой неделе мальчик начал жаловаться на боли в животе и был госпитализирован, где врачи предположили, что у мальчика опухоль.

Они были шокированы, когда УЗД и КТ выявили «развитый» мертвый плод в животе мальчика, сообщает International Business Times.

Доктор Ширшенду Гири, выполнивший операцию по устранению плода, сообщил IBN Live: «Мертвый эмбрион — у которого были руки, ноги, ногти и частично сформированная голова— был устранен из тела ребенка в ходе длительной операции. Сейчас состояние мальчика стабильное, он находится под пристальным наблюдением врачей». Плод внутри плода — невероятно редкая аномалия, когда недоразвитый плод остается в теле своего близнеца.

На ранних стадиях беременности, если женщина беременна близнецами, один из близнецов может попасть к другому через пуповину. Там он становится паразитом, в зависимости от жизнеспособности своего сожителя. Зачастую он не выживает после родов, однако может оказывать серьезную угрозу для жизни второго близнеца.

Плод обнаруживают в животе в 80% случаев, хотя были сообщения об обнаружении его в черепе.

eurolab.ua

Страницу подготовила Анна ВОЛОДАЩУК

ЗАГЛЯНЕМ У СЯМЕЙНЫ АЛЬБОМ

ДВА АКТЫВЫ: КАМСАМОЛЬСКІ І ПЕНСІЯНЕРСКІ

ДА 75-ГОДДЗЯ СЛОНІМСКАГА КАЛЕДЖА СЕЛЬГАСВЫТВОРЧАСЦІ

Зірнуўшы на гэтыя здымкі, на першы погляд здаецца, што паміж імі няма нічога агульнага. Але вы памыляецеся, паважаныя чытачы.



Дэлегаты абласной камсамольскай канферэнцыі 1974 года



Слонімскія пенсіянеры сістэмы прафтэхадукацыі

Вось перад вамі актыў слонімскай моладзі на абласной камсамольскай канферэнцыі ў 1974 годзе. Сярод іх тры маладыя чалавекі, якія ў свой час працавалі ў СПТВ №5. Гэта Анатоль Бялянін (крайні злева ў верхнім радзе), які ў далейшым быў дырэктарам навучальных устаноў і намеснікам старшыні гарвыканкама, Уладзімір Пастарнак (сёмы злева ў верхнім радзе), былы дырэктар Слонімміжрайгаза, і Мікалай Емельянчук (сёмы злева ў ніжнім радзе), які пасля працы ў камсамольскіх і партыйных органах быў накіраваны намеснікам дырэктара ў родную альма-матар. Але самая прыгожая кветка на гэтым здымку — пераможца ўсесаюзнага конкурсу «Дзяўчаты — на трактар» Марыя Жарко (на здымку трэцяя злева ўнізе), якая скончыла філіял СПТВ №5.


На другім здымку — пенсіянеры, якія шмат зрабілі для развіцця прафесійна-тэхнічнай адукацыі ў Слоніме. На жаль, сёння ўжо стала не прэстыжна запрашаць на сустрэчы ветэранаў працы.

Хачу адзначыць, што ў свой час нават камсамол рыхтаваў рэзерв перспектыўных кіраўнічых кадраў. Сярод такіх на першым здымку — Анатоль Цярэнін, Лідзія Навасельцава, Іван Майсюк, Мікалай Тачоны, Мікалай Жукоўскі, Анатоль Сураў, Ніна Побыт і іншыя. А сёння мы дажыліся, што на ўсю краіну народ не ведае дастойных на пасаду прэзідэнта.

Мікола АНТОНАЎ
Здымкі з архіва Мікалая ЕМЕЛЬЯНЧУКА

КРЫЖАВАНКА-ПЕРАКЛАД

Перакладзіце, калі ласка, словы з рускай мовы на беларускую (адказы змесцім у наступным нумары).



АД УЛАДЗІМІРА ВАШУТЫ

1. Кожевник.
2. Летчик.
3. Блоха.
4. См. фото.
5. Колыбель, люлька.
6. См. фото.
7. Рюмка.
8. Прятки (игра).
9. См. фото.
10. Каратель.
11. Крыльцо.
12. Крыса.
13. Север.
14. Бекас.
15. Памятник.
16. Разрешение, позволение.
17. Арбуз.
18. Охапка.
19. Икота.
20. Отец.
21. Тополь.
22. Одеяло.
23. Хоровод.
24. См. фото.

ПРОСТА АНЕКДОТ

☺ ☺ ☺

Все люди делятся на: 1) сов (встают и ложатся поздно); 2) жаворонков (встают и ложатся рано); 3) дятлов — из-за них совы встают рано, а жаворонки ложатся поздно.

☺ ☺ ☺

— Дорогой, я опаздываю, налей себе чай сам.

— Хорошо... А сколько ложечек сахара я люблю?

☺ ☺ ☺

Ленин был большим шутником. Он пришел к власти, пообещав крестьянам землю. Но те ее так и не увидели... Но крестьяне тоже были большими шутниками. Поэтому Ленин не видит землю до сих пор...

☺ ☺ ☺

— Тата, а чаму мы ямо бульбу, а нашы суседзі пастаянна смажаць шашлыкі?

— А гэта, сынок, таму, што яны гультаі. Яны не хочуць яе саджаць, даглядаць і збіраць каларадскага жука.

☺ ☺ ☺

Вот у меня соседка молодец! Двадцать минут мужа матом крыла и ни разу не повторилась... А чего — учительница русского языка и литературы!

☺ ☺ ☺

Классно отдохнул — это когда на следующий день на работе, наливая чай, держишь кружку под наклоном «чтоб не пенилось».

☺ ☺ ☺

Стук в дверь.

— Откройте, милиция!

Голос за дверью:

— Ну-у и на фига вы тааам за-а-кры-ы-ы-лись?

☺ ☺ ☺

— А какой у тебя рост?

— 145.

— Ты такая маленькая принцесса. А сколько весишь?

— А вешу еще меньше — 120.

☺ ☺ ☺

Когда просят убрать в комнате, цитируй Эйнштейна: «Только дурак нуждается в порядке — гений господствует над хаосом».

☺ ☺ ☺

— Любимый, ведь правда, что я тебе дана Богом?

— Да, родная... Вот только не знаю, за какие грехи...

☺ ☺ ☺

—Почему блондинки, когда пьют таблетки, пищат?

—Потому что на упаковке написано: «После приема пищи»

☺ ☺ ☺

Он назвал ее курицей, и она сразу снесла ему яйца... С разбегу...

☺ ☺ ☺

Не работаешь — жить не на что! Работаешь — жить некогда!

☺ ☺ ☺

Врач знакомится с результатами анализов.

Пациент:

— Ну как, доктор?

— Можете взять кредит.

— Так отдавать нечем.

— А вам и не придется.

☺ ☺ ☺

— Милая, я летел к тебе на крыльях любви!

— Три дня?!.

— Ветром сносило...

Старонку падрыхтавала Наталля ІВАНОВА

СЛОНИМСКИЕ ШКОЛЬНИКИ РАССКАЗАЛИ, ПОЧЕМУ НУЖНО ЧИТАТЬ КНИГИ

Ср 7 октября



Ученики СШ №10 Александра Ильина, Анна Климович, Егор Андрушевич, Елена Апанович, Валерия Барщевская (слева направо) провели флешмоб

В рамках Недели культуры в Слониме прошёл День библиотек.

В этот день библиотеки города и района проводили различные мероприятия.

Так, в сквере на площади Ленина маленькие читатели рассказывали стихи, отгадывали загадки, называли книжных героев, о которых читали, и пели песни.

Школьники СШ №10 провели своеобразный флешмоб, рассказав, зачем нужно читать книгу. А затем ребята прохожим загадывали загадки, поднимая им настроение.

Работали и книжные выставки «Свет знаний книга открывает», «От первых свитков до больших томов».

Татьяна ПЛАХЕТКО
Фото автора



Загадывали загадки прохожим

Слонимские гимназисты на мероприятии рассказывали стихи, отгадывали загадки и фотографировались на память с необычной книгой, сделанной руками работников детской библиотеки



Маленький читатель

АЛІМПІЯДА АД АЛЯКСЕЯ ЯКІМОВІЧА

Працяг
Пачатак у № 40, 41

Працягваем III этап

«Праменьчык» прапануе сваім сябрам прыняць удзел у Алімпіядзе, якую склаў пісьменнік Аляксей Якімовіч. Адкажыце на складзеныя ім заданні па беларускай мове і краязнаўству. Пераможцы і актыўныя ўдзельнікі будуць узнагароджаны кнігамі з аўтографамі Аляксея Якімовіча.

Алімпіяда будзе праходзіць у чатыры этапы, кожны з якіх будзе уключаць некалькі пытанняў.

Пераможцам стане ўдзельнік, які набярэ найбольшую суму ачкоў па выніках этапаў.

21. Каля хаты, у якой нарадзіўся Янка Купала, стаіць помнік паэту. Колькі кустоў руж пасаджана вакол помніка Янку Купалу?

22. Якія населеныя пункты Беларусі маюць назвы, што складаюцца з двух слоў?

23. Якую назву мела адзінка (яна не была метрычным тэрмінам) колькасці льноваланка, што адпавядала 10 – 25 жменям?

24. Як раней называлі маёмасць і грошы, што давалі бацькі або родныя маладой, калі яна выходзіла замуж?

25. Якую назву мае пляскаты драўляны брусок з ручкай, якім перылі (пралі) бялізну пры мыцці, палотны пры адбельванні; ім таксама абівалі лён. На Беларусі вядомы з 11 – 12 ст.ст.

26. Якую назву мае драўляная прылада для прадзення воўны, ільняной і пяньковай кудзелі?

27. Адно з паданняў сведчыць, што князь Радзівіл, узвёўшы замак, быццам бы доўга не мог прыдумаць яму назву. Ён загадаў слугу ісці да людзей і запомніць першае слова, якое яны вымавяць. Слуга сустрэў чалавека, які нёс рыбу, і спытаў у яго, ці свежы карп. Не, карп быў не свежы. Як князь пасля гэтага паведамлення назваў замак?

Таццяна ПЛАХЕТКА

СКАНВОРД С КАРТИНКАМИ

Необходимо угадать, кто или что изображено на картинке, и разгадать сканворд.



БОЛЬШЕ МАТЕРИАЛОВ И ФОТО — НА САЙТЕ WWW.GS.BY

Старонку падрыхтавала Таццяна ПЛАХЕТКА

Намеснік галоўнага рэдактара
Мікола КАНАНОВІЧ
Журналісты
Уладзімір ШУМЕЛЬ
Яўген ВАЛАДАШЧУК
Кацярына ЯНУШЭВІЧ
Таццяна ДЗЕНІСЮК
Алена КАСЦЮК
Стыль-рэдактар
Жанна ПЛЕШКО
Рэдакцыя сайта www.gs.by
Рэдактар
Дзмітрый МІЦКЕВІЧ
Спецыяліст па рэкламе
Марыя ІЛЫЧОВА

Галоўны бухгалтар
Святлана ПРЫМАВА
Бухгалтар
Вольга БУРСЕВІЧ
Аддзел падпіскі і продажу
Аляксей НАВІЦКІ
8-(029) 322-06-42
Вёрстка і дызайн
Віталь ЕМЯЛЬЯНАЎ
Сяргей РЭКУН

Тэлефоны рэдакцыі:
т/факс: **8 (01562) 5-09-31,**
Тэл. 6-36-58, 6-36-68, 6-36-54, 6-36-44.
МТС: **8-029-584-87-32**
Velcom: **8-029-133-04-21**
Skype — gazslon
(9.00-18.00)
Для карэспандэнцыі:
231799, г. Слонім,
вул. Чырвонаармейская, д. 41
e-mail: gs@gs.by,
gazslon@gmail.com

Рэкламная служба
Начальнік рэкламнай службы
Ганна ВАЛАДАШЧУК
anna@gs.by
8-(029) 612-26-43
Супрацоўнікі
Наталля СТРУПАВЕЦ
Людміла КАМЯНЕЦКАЯ
Ірына ФРАНОВІЧ
8-(044) 715-90-03
8-(01562) 6-60-56
(9.00–16.00)
т/факс:
8-(01562) 5-09-27

Прыём аб'яў і падпіска:
г. Слонім, Чырвонаармейская, 73 Б
(будынак АРЗ)
Працуем аўторак — пятніца 9^{00}-17^{00}
субота — нядзеля 9^{00}-15^{00}
выхадны — панядзелак
8-(044) 762-48-39

погода на неделю

	утро	день	вечер
СРЕДА, 14 октября	2^0	9^0	8^0
ЧЕТВЕРГ, 15 октября	4^0	9^0	9^0
ПЯТНИЦА, 16 октября	4^0	8^0	7^0
СУББОТА, 17 октября	6^0	10^0	10^0
ВОСКРЕСЕНЬЕ, 18 октября	8^0	10^0	9^0
ПОНЕДЕЛЬНИК, 19 октября	5^0	9^0	5^0
ВТОРНИК, 20 октября	7^0	9^0	5^0
СРЕДА, 21 октября	7^0	9^0	5^0

www.meteoprog.by

«Давай познакомимся»



Хотите встретить свою вторую половинку, но у вас это не получается? «ГС» поможет вам найти друг друга.

Давайте объявление, приносите свои фото с кратким рассказом о себе по адресу: г. Слоним, ул. Красноармейская, 73 Б, тел. для справок 6-60-56, 8-044-762-48-39.

Хочу познакомиться для дружеского общения с доброй, интересной и порядочной женщиной в возрасте 40-50 лет, о себе: в Слониме живу недавно, но постоянно, замужем, православная, люблю искренних и жизнерадостных людей, работаю воспитателем в садике. Тел. 8-029-809-28-02.

***

Дмитрий, 26 лет, без в/п, спортивное телосложение, хочу обзавестись семьёй, буду любящим и нежным мужем. Тел. 4-49-25, Гончарук Дмитрий

Поздравления в «ГС» запомнятся вам надолго

Язэпу ПАЛУБЯТКУ — 60!

Калектыў рэдакцыі «Газеты Слонімскай» шчыра віншуе ўласнага карэспандэнта газеты на Мастоўшчыне Язэпа Палубятку з 60-годдзем!

У Язэпаў юбілей — 60! —
Яму зычым пісаць пра дзяўчат,
Пра цікавых прыгожых жанчын
І пра мужных мастоўскіх мужчын.
Каб заўсёды любіў родны край,
Не трапляў у жыццёвы раздрай
Ды на Нёмана два берагі
Заставаўся для ўсіх дарагі
Як найменей да сотні гадоў,
А для гэтага, брат,
будзь здароў!



Рэдакцыя «ГС»

ФОТАФАКТ



ФОТА ЯЎГЕНА ВАЛАДАШЧУКА

Галоўная вуліца вёскі Асабнякі Слонімскага раёна з`яўляецца добрай бегавой дарожкай для спартсменаў

БЛАГОДАРНОСТЬ

Выражаем огромную благодарность и слова признательности руководству Слонимской ЦРБ — главврачу Моисеенковой Г.М., председателю профорганизации Дягель Л.Э. и всем организаторам за подаренный нам праздник — День пожилых людей, за заботу, внимание о нас, пожилых людях. Желаем вам здоровья, успехов, удач, больше светлых и радостных дней, быть верными своей профессии, а всех женщин поздравляем с Днем матери. Низкий вам поклон.

Храни вас Господь.

С уважением, КОРОНЕЦ А.И., участники праздника

АНЕКДОТЫ

Встал ночью в туалет, свет горит, занято. Ладно, иду обратно.

И все бы ничего... если бы я не жил один.

☺ ☺ ☺

— Первого человека на Земле звали Адам — это знают все. А вот как будут звать последнего человека на Земле — не знает никто.

— Я знаю: Надя!

— Почему?

— Потому что Надежда умирает последней!

☺ ☺ ☺

Директор фирмы наткнулся на объявление по продаже того же, чем торгует он сам, только дешевле, и решил позвонить.

И узнал голос сторожа со своего склада.

☺ ☺ ☺

Мама: Сынок, ты что на обед хочешь?

Сын: Мне как и папе.

Мама: Пора тебе уже свое мнение иметь, что ты все на других смотришь.

Сын: Ну мне тогда так же, как и тебе.

Мама: Вот молодец.

Дзякуй за тое, што выбралі "Газету Слонімскую"!

Галоўны рэдактар Віктар Уладзіміравіч Валадашчук, victor@gs.by

ЗАСНАВАЛЬНІК **Віктар Уладзіміравіч ВАЛАДАШЧУК**
Газета друкуецца на беларускай і рускай мовах

Рэгістрацыйнае пасведчанне №64 ад **05.03**.2009 года. выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Свидетельство о госрегистрации УП "Газета Слонимская" ЮКЛ № 001845, выданное Гродненским областным исполнительным комитетом от **03.04**.2003 г.

email: gs@gs.by
gazslon@gmail.com
Юрыдычны адрас: 231800, г.Слонім, вул. Чырвонаармейская, 41
Тыраж 4010 экз.

Падпісныя індэксы:
64042 (індывідуальная)
63818 (ведамасная)
63646 (ільготная)
Свабодны кошт

Час падпісання да друку па графіку 13 кастрычніка 2015 года **16:00**.
Аб'ём — шэсць умоўных друкаваных аркушаў.

Надрукавана ў друкарні ГАУПП "Гродзенская друкарня" г.Гродна, вул. Паліграфістаў, 4, індэкс 230025.
Заказ № 5889